АФІЦЫЙНА

# У НАС НОВАЯ КАЛЕГА

**Рашэннем Прэзідыума Грамадскага аб’яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі» ад 24 красавіка 2026 года ў шэрагі рэспубліканскай пісьменніцкай арганізацыі (Гродзенскае абласное аддзяленне) прынятая празаік, дзіцячая пісьменніца Ірына САЛАТА (г. Гродна).**

**Ірына Аркадзьеўна Салата нарадзілася** 11 красавіка 1960 года ў вёсцы Сліжы Пескаўскія, у сям’і калгаснікаў. У 1977 годзе закончыла Азёркаўскую сярэднюю школу Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці. Вышэйшую адукацыю атрымала ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы. Амаль сорак гадоў працуе настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў школах г. Гродна.



**Ірына Аркадзьеўна Салата**

Літаратурную дзейнасць Ірына Аркадзьеўна Салата пачала ў сталым узросце, з вершамі, пасля ўдзелу ў конкурсе «Поэзия – души движенье» (2016), які ініцыявала Гродзенская гарадская арганізацыя Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі. Выхад у фінал стаў штуршком для далейшага выказвання сваіх думак у вершаванай форме. З вершам пад назвай «Нашчадкам» паэтэса-аматар стала ўдзельнікам літаратурнага Інтэрнэт-зборніка «У вянок Максіму» да 125-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча (на сайце Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, 2016). Але няўрымслівая душа творцы патрабавала большага. У выніку серыі кансультацый у абласной пісьменніцкай арганізацыі, пасля ўважлівага вывучэння кругагляду, духоўнага свету пісьменніцы, яе тэмпераменту, сістэмы жыццёвых каштоўнасцяў і шэрагу іншых фактараў у Ірыны Аркадзьеўны быў адкрыты талент празаіка. І гэта заслуга перш за ўсё Людмілы Антонаўны Кебіч, старшыні ГрАА СПБ, вопытнай знаўцы чалавечых душ, якая змагла своечасова разгледзець зусім іншае, новае, невядомае і напэўна, нават нечаканае ў жанчыне-педагогу. Больш за тое, не толькі разгледзела сама, але і змагла пераканаць Ірыну Аркадзьеўну ў неабходнасці радыкальнага стратэгічнага манеўру – змены асноўнага літаратурнага амплуа. Як вынік – свет айчыннай літаратуры атрымаў самабытнага аўтара з непаўторным творчым почыркам, чыю малую прозу можна лёгка адрозніць ад творчасці сотняў іншых айчынных празаікаў. Асноўным сродкам уздзеяння на чытача Ірына Салата абрала глыбокі псіхалагізм. Яе апавяданні, празаічныя мініяцюры («пейзажныя замалёўкі», як іх называе сама пісьменніца) у мастацтве слова сталі ўнікальнай з'явай па сваёй ідэйна-тэматычнай глыбіні і ўніверсальнасці. Яны поўныя метафарычнай вобразнасці і лірызму, уласцівых паэзіі; у іх нямала па-народнаму мудрых філасофскіх абагульненняў, намёкаў, недаказанасці, уласцівых драме і публіцыстыцы; у яе творах правіць баль чароўная фантазія беларускай і еўрапейскай казкі; якую дапаўняюць характэрныя для эпасу непрадказальнасць і дынамізм.

Сёння з упэўненасцю можна сцвярджаць: Ірына Салата – пісьменніца-універсал, чыя проза сугучная часу і навакольнаму свету. Любоў да слова, вытанчаны эстэтычны густ, ідэальнае пачуццё прыгажосці, памножаныя на багаты жыццёвы і прафесійны вопыт, сфармавалі ў свядомасці пісьменніцы магутную базу для мастацкіх задум і іх яркага, арыгінальнага ўвасаблення. Яе творы зразумелыя, цікавыя дзецям, падлеткам і вельмі карысныя ў выхаваўчым аспекце. Гучаць яны сучасна, арганічна, напісаны на сакавітай беларускай мове, нясуць энергетыку спакойнага, размеранага жыцця, успрымаюцца, як шчыры, пранікнёны дыялог чалавека з прыродай, а гэта значыць, і з уласнай душой. Незалежна ад узросту яе патэнцыйны чытач – чалавек цэльны, гарманічны. Як прырода, як само жыццё, як зямля, на якой ён жыве тысячагоддзямі, жыве і любіць гэтае жыццё, нават не спадзеючыся на ўзаемнасць. Творы пісьменніцы проста неабходныя настаўнікам і бацькам, зацікаўленым у паўнавартасным і ўсебаковым асобасным развіцці чалавека будучыні, Новага Чалавека, якому будзе па сілах тое, што, магчыма, не ў поўнай меры ўдалося нам, сённяшнім. Цяпер яе час. Час пісаць і распавядаць сваю гісторыю.

Ірына Аркадзьеўна Салата аўтар кніг: «Мой край лясны – мая Радзіма» (2021); «Вясновыя адкрыцці Ганначкі і Кастусіка» (2021); «Акварэлі пачуццяў» (2022); «Казка пра чароўныя лялькі і іх начныя размовы» (2023); «Лялькі з беларускага куфэрка» (2023); «Пра хатнічка Ладнічка і модніцу сойку» (2023); «Русалчына затока» (2025); «Дзівосная краіна-казка» (2025). Немалаважны факт: большасць з гэтых кніг выйшла ў

дзяржаўных выдавецтвах. Творчасць пісьменніцы прадстаўлена ў тэматычных калектыўных зборніках: «Чарнабыльніку вечная горыч»; «Песнярам Айчыны»; «Памяці вечны агонь»; у альманаху «На Нёманскай хвалі». Апавяданні Ірыны Салаты друкуюцца ў часопісе «Алеся»; штомесяц з'яўляюцца на старонках газеты творчай інтэлігенцыі Беларусі «Літаратура і мастацтва» («ЛіМ»), атрымалі хвалебныя водгукі рэдакцыі.

Ірына Салата – дыпламант літаратурнага конкурсу Саюза пісьменнікаў Беларусі і часопіса «Алеся» (намінацыя «Проза», 2022). Дыпламант Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу, арганізаванага Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі ў намінацыі «Вялікая Айчынная вайна ў памяці маёй сям'і» (2021). Пераможца І Рэспубліканскага конкурсу творчых пісьмовых работ «За што я люблю родную зямлю» ў намінацыі «Родныя краявіды» (2023). Заняла першае месца ў арганізаваным Гомельскім абласным аддзяленнем СПБ адкрытым літаратурным конкурсе «Сям'я – аснова кахання і шчасця» (да 100-годдзя з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна, 2021). Пераможца IV Рэспубліканскага літаратурнага стартапа LitUP (2023).

Імя беларускай пісьменніцы з Гродна Ірыны Салаты знаёма тым, хто цікавіцца сучаснай літаратурай, робіць гэта, як сапраўдны патрыёт – па прынцыпе «усё пачынаецца са свайго». Для літаратурнай супольнасці Прынёманскага краю і сама пісьменніца даўно стала сваёй. Актыўна ўдзельнічае ў грамадска-культурным жыцці горада, вобласці і рэспублікі, імкнецца не прапускаць ніводнага мерапрыемства СПБ. З чалавечых якасцяў Ірыны Аркадзьеўны неабходна перш за ўсё адзначыць яе дабрыню, інтэлігентную прыстойнасць, чалавечнасць, спагадлівасць, дружалюбнасць. Пісьменніца заўсёды гатовая прыйсці на дапамогу, падзяліцца вопытам, падтрымаць добрым словам. Яна ўжо не ўяўляе сваё жыццё без мастацкага слова і без усяго, што з ім звязана. А нам ужо нельга ўявіць сабе наша літаратурнае жыццё без Ірыны Аркадзьеўны і ўсяго, што звязана з ёй. Можна не сумнявацца – пісьменніца адрозніvае ролю незалежнага літаратара ад знаходжання ў вялізнай сям'і аднадумцаў. Якраз дзякуючы такім людзям, як празаік, дзіцячая пісьменніца Ірына Салата, наша пісьменніцкая арганізацыя з годнасцю носіць гучнае і пачэснае імя – Саюз.

Ад імя нашага творчага калектыву віншуем празаіка, дзіцячую пісьменніцу Ірыну Аркадзьеўну Салату з уступленнем у Саюз пісьменнікаў Беларусі. Жадаем моцнага здароўя, невычэрпнага натхнення і яшчэ шмат здабыткаў на ніве роднага мастацкага слова.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**